і смерць гэтых і многіх іншых персанажаў п'ес Караткевіча прасякнута ўзнеслым гераічным пафасам.

Уяўленне аб свабодзе свае чалавечае асобы ад сацыяльнага ці палітычнага ўціску ў свядомасці героеў твораў Караткевіча шчыльна зліавана з асэнсаваннем альбо адчуваннем неабходнасці свабоды быць самім сабой, свабоды быць беларусам, жыць па традыцыях і звычаях роднага народа, бацькаўшчыны. Таму яны, бароначы сябе, бароняць і сваю Радзіму. У глыбока гуманістычнай канцэпцыі асобы ў пісьменніка жыцце чалавечае зліваецца з жыццем народным і толькі тады набывае сэнс і апраўданне. У "Калісьці чатырох чараўніц" малады Янка Луцэвіч, па-свойму працягваючы справу Каліноўскага, занепакоены клопатам пра захаванне душы народнае і свае ўласнае, выпраўляе пайсці ў свет, каб спазнаць жыцце народа ва ўсей разнастайнасці і багацці яго праяў і адшукаць свой Голас, які б увабраў у сябе ўсе галасы роднай зямлі. Ен не лічыць, як ягоная маці, што кідае сваю зямлю. Наадварот, ен пераканаўны ў тым, што ен якраз ідзе да яе сплочваць свой доўг, бо нязмерныя перад ею даўгі ўсіх тых, "хто умее пісаць і думаць".

Ацэнка жыццевага шляху і творчасці Янкі Купалы, дадзеная ў п'есе Караткевічам, цалкам дапасуецца да самога пісьменніка. Мы цяпер можам з упэўненасцю сказаць, што жыцце і творчасць гэтага выдатнага мастака і чалавека ўсе больш зліваецца з жыццем яго роднага народа, для абуджэння і адраджэння душы якога ен столькі зрабіў.

## ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ У ТВОРЧАСЦІ В.АДАМЧЫКА

Н.Л.Суддзева

Сярод праблем, якія ўздымаюцца сучаснай беларускай літаратурай, праблемы нацыянальнай гісторыі, бадай што, найбольш важкія. Што датычыцца творчасці В.Адамчыка, то яна практычна ўся скіравана на выпрацэнне менавіта гэтых праблем. Прынамсі, самыя буйныя творы пісьменніка - "Чужая бацькаўшчына" (1978), "Год нулявы" (1983), "І скажа той, хто народзіцца" (1985), "Голас

крыві брата твайго" (1990), што у сукупнасці складаюць вядомую тэтралогію – адметныя перш за усе імкненнем мастака да уваскрэшэння складаных старонак гістарычнага мінулага Беларусі.

Тры першыя раманы В.Адамчыка, якія ствараліся у так званы "перабудовачны" час, вылучаюцца спробай мастацкага асэнсавання гісторыі заходнебеларускага сялянства напярэдадні і у пачатковы перыяд яе уз'яднання з Савецкай Беларуссю. У адрозненне ад большасці беларускіх пісьменнікау, што пісалі пра Заходнюю Беларусь, В.Адамчык свае кнігі прысвяціу не гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы на былых польскіх "усходніх крэсах", а, думаецца, зусім мэтанакіравана заастрыу увагу на негатыуных выніках для большасці насельніцтва Заходняй Беларусі гвалтоуных форм кіравання, раскрываючы драму народа, які губляе свой нацыянальны твар, пачуцце нацыянальнай прыналежнасці, нацыянальнага гонару. Вылучаючы у якасці галоуных персанажау сваіх творау Алеся Мондрую, Уласа і Міцю Корсакау, пісьменнік імкнецца спасцігнуць самую сутнасць нацыянальнага характару заходнебеларускага сялянства, духоуны стан якога складвауся ва умовах сацыяльнага і нацыянальнага прыгнету, што практычна не магло не адбіцца на яго узроуні.

Так, Алеся Мондрая, каб набыць кавалак зямлі, ідзе на страшэннае злачынства – атручвае старую свякруху і хворую залоуку. У свядомасці галоунай гераіні В.Адамчыка рэаліі варожага вонкавага свету, самавольства і поунае абясцэньванне чалавечага жыцця – норма, трансфармуецца такім чынам, што гэтая працавітая жанчына становіцца забойцам.

Працавітасць, сумленнасць, духоуная чысціня – гэтыя станоучыя рысы нацыянальнага характару увасабляе, бадай што, самы прывабны герой першых трох раманау В.Адамчыка Улас Корсак.

З вобразам маладога Міці Корсака пісьменнік звязау ідэю нацыянальнага і сацыяльнага адраджэння. Міціны "пошукі Беларусі", пошукі справядлівых чалавечых зносін – адлюстраванне шматпакутлівых спроб заходніх беларусау "людзьмі звацца".

Вырашаючы праблему нацыянальнага характару, В.Адамчык у першых сваіх раманах быу далекі ад жадання ідэалізаваць духоуны і сацыяльны стан заходнебеларускага сялянства. І не як нараканне гэтаму народу, папрок у яго адрас, а як глыбокае супера-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыванне яго паламанаму лесу, драматычнаму лесу народа-працаўніка гучалі "Цяжкая бацькаўшчына", "Год нулявы", "І скажа той, хто народзіцца" – раманы, у якіх яскрава праасочвалася галоўная ідэя неабходнасці барацьбы за лепшы лес і будучыню, ідэя неабходнасці актывізацыі народнай самасвядомасці.

Апошні раман В.Адамчыка "Голас крыві брата твайго", які быў напісаны ў так званы "перабудовачны час", рэзка змяняе канцэптуальную выснову папярэдніх твораў. Прысвяціўшы свой апошні раман падзеям Айчыннай вайны, пісьменнік тут нечакана робіць заяўку на канцэпцыю фатальнай асуджанасці чалавечага жыцця ў навакольным свеце вялікай гісторыі. Народ – ахвяра барацьбы аднолькава варожых яму сіл – немцаў і паліцыянтаў, з аднаго боку, партызан, з другога, ён увогуле не супрацiўляецца фашысцкай акупацыі. Жаданне кардынальнага перагляду падзей ваеннага часу як даніна модзе прывяло пісьменніка да сцвярджэння такога аблічча народа, які ў сваей ваеннай гісторыі мае тыя страшныя яе старонкі, дзе чалавек ідзе вайной не на ворага свайго, а на брата свайго, не чуючы голасу яго крыві.

## СПАЛУЧЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА І АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАГА Ў ТВОРАХ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ ЗАМЕЖНАЙ ЛІТАРАТУРЫ)

С.В.Саладоўнікаў

Нацыянальнае і агульначалавечае вельмі спецыфічна праяўляецца і ў мастацтве наогул, а асабліва – у літаратуры.

Граніц у мастацтве, як і ў навуцы, няма. Адзін пісьменнік зробіць адкрыццё (новы прыем, матыў, сюжэт, вобраз, новая нейкая фарба ці рыса), а другі пісьменнік, на другім канцы света, наогул, зусім іншай культуры – прыменіць гэта мастацкае вынаходства, і яго творы зайграюць, і зайграюць нацыянальна. Безумоўна, у творах мастацтва сплятаецца і асоба аўтара-мастака, і яго нацыянальны менталітэт, і агульначалавечае.

На краінах і нацыянальных літаратурах вандруюць тыпы, у якіх адлюстроўваюцца агульначалавечыя рысы. Гэта звязана з тым,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ